# Я БАЧУ!
## калекцыя коміксаў



## Прывітанне, дружа!

Ты трымаеш у руках зборнік з трох коміксаў, створаны спецыяльна для дабрачыннага праекта «Я бачу!», які рэалізавалі Беларускі дзіцячы фонд і кампанія А1 пры падтрымцы Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Цягам чатырох гадоў мабільныя брыгады ўрачоў-афтальмолагаў на спецыяльна абсталяваных аўтамабілях наведвалі сельскія школы Беларусі. Кожны год урачы ездзілі ў новую вобласць, каб праверыць зрок у школьнікаў з самых аддаленых куткоў нашай краіны. З 2016-га па 2019 год урачы агледзелі больш за 50 000 дзяцей з Магілёўскай, Гомельскай, Брэсцкай і Віцебскай абласцей.

Спецыялісты не толькі правяралі зрок, але і распавядалі, як правільна аб ім клапаціцца. Зараз пра тое, як дапамагчы вачам адпачыць пры чытанні, табе будуць нагадваць героі зборніка «Я бачу!». У захапляльнае падарожжа па старонках комікса ты адправішся разам з Алесяй, Багданам і Ільёй. У школьнікаў ёсць чароўныя акуляры, якія даюць ім суперсілу і дапамагаюць знаходзіць выйсце з няпростых сітуацый.

Спадзяёмся, што ты не забудзеш зрабіць разам з героямі практыкаванні для вачэй, якія мы падрыхтавалі для цябе. Мы ўпэўненыя, што ты будзеш беражліва ставіцца да свайго здароўя і своечасова наведваць афтальмолага, таму што добры зрок – суперсіла кожнага.

Убачымся!






Гісторыя
Вольга Алданава
і Мікіта Сеннікаў

Малюнак
Вольга Алданава

# Погляд у мінулае




АМАЛЬ ДАЕХАЛА, МАМ.


А ДЗЕ ГЭТЫЯ ЗАКАТКІ? ДЗЕ? А, У СКЛЕПЕ.
ШТО ЗАБЫЛА?
ХРРРРРР
І ЯК МНЕ СКЛЕП БЕЗ КЛЮЧА АДЧЫНІЦЬ?


НАВОШТА ЯГО ЎВОГУЛЕ ЗАМЫКАЦЬ? ТАМ ТОЛЬКІ АГУРКІ Ў СЛОІКАХ.
ДОБРА-ДОБРА. ПАШУКАЮ ЗАПАСНЫ КЛЮЧ У ХАЦЕ.
ДОБРА, ШТО Я ГЭТА МЕСЦА ВЕДАЮ, ЯК САВЮ КІШЭНЮ!


ВУНЬ СКЛЕП...
АГА, А ВОСЬ
І КЛЮЧ!
ДЗЫНЬ


НАВОШТА ЎВОГУЛЕ СТОЛ НА ВЕЧКУ ДЛЯ СКЛЕПА СТАВІЦЬ? ГЭТА Ж НЕБЯСПЕ...
ШШШШРРХХХ
ДЗВЕРЫ НА ГАРЫШЧА АДЧЫНЕНЫЯ?
АЛЕ МАМА З ТАТАМ ЗАЎЖДЫ ІХ ЗАМЫКАЛІ...
НЕ-НЕ! КАЛІ ДЗВЕРЫ ЎВЕСЬ ГЭТЫ ЧАС БЫЛІ ЗАЧЫНЕНЫЯ, ЗНАЧЫЦЬ, МНЕ НЕ ВАРТА ТУДЫ ХАДЗІЦЬ.


ХУЦЕНЬКА ПАГЛЯДЖУ, ШТО ТУТ ЁСЦЬ, І АДРАЗУ НАЗАД!
НУ ВОСЬ! УСЯГО ТОЛЬКІ СКРЫНКІ СА СТАРОЙ ФАРБАЙ.


А ТАМ ШТО?
УХ ТЫ!
УХ ТЫ!
УХ ТЫ!


ЦІКАВА, А ШТО ЛЯЖЫЦЬ У ГЭТАЙ ШКАТУЛЦЫ?
ВІДАЦЬ, ГЭТА БЫЎ ДЗЯДУЛЕЎ ПАТАЕМНЫ КАБІНЕТ. КЛАС! Я ДАКЛАДНА ЗНАЙДУ ТУТ ШМАТ ЦІКАВАГА!
ДЗЯДУЛЕВЫ АКУЛЯРЫ... ВОСЬ ДЗЕ ЯНЫ БЫЛІ ЎВЕСЬ ГЭТЫ ЧАС.
ДЗЯДУЛЮ ЛІЧЫЛІ ДЗІВАКАВАТЫМ З-ЗА ЯГО ЛЮБОВІ ДА МІСТЫКІ І ВЫНАХОДНІЦТВА. А МНЕ ПАДАЕЦЦА, ШТО ЁН БЫЎ ГЕНІЕМ!


ТАК, А ТУТ У НАС ШТО...
ОЙ!
ОГООО! ШТО ГЭТА?


ГЭТЫЯ СІМВАЛЫ З'ЯЎЛЯЮЦЦА З-ЗА АКУЛЯРАЎ?
А ШТО БУДЗЕ...
...КАЛІ ІХ НАЧАПІЦЬ?
ЗНАКІ КУДЫСЬЦІ ЎКАЗВАЮЦЬ!
ПАДАЕЦЦА, СЮДЫ!


ХМММ...
ШШШШУРХ
АГА! Я ВЕДАЮ, ШТО РАБІЦЬ!
ТРЭБА ЗНАЙСЦІ АДРОЗНЕННІ ПАМІЖ ГЭТЫМІ КАРЦІНАМІ.


Я ЗМАГЛА ЗНАЙСЦІ ТОЛЬКІ ТРЫ АДРОЗНЕННІ.
ОЙ! ЗНАКІ ЗНОЎ КУДЫСЬЦІ ЎКАЗВАЮЦЬ!
АГА, ЯНЫ ВЯДУЦЬ МЯНЕ Ў СПАЛЬНЮ БАБУЛІ І ДЗЯДУЛІ.


НАПЭЎНА, НА ГЭТЫМ ФОТАЗДЫМКУ Я ТАКСАМА МУШУ ШТОСЬЦІ ЗНАЙСЦІ.
ЦІ КАГОСЬЦІ...
Справа №5


ХА! ТУТ ЖА ДЗЯДУЛЯ! ЛЕДЗЬ ЯГО ПАЗНАЛА. ТОЛЬКІ ПА АКУЛЯРАХ ВЫЗНАЧЫЛА.
Справа №4
ХВІЛІНКУ. ЁН ТРЫМАЕ ТЭЧКУ З НУМАРАМ 4. А Ў КАРЦІН БЫЛО ТРЫ АДРОЗНЕННІ.
ЗРАЗУМЕЛА! РАШАЮЧЫ ЗАГАДКІ, Я ЗБІРАЮ КАМБІНАЦЫЮ З САКРЭТНЫХ ЛІЧБАЎ! АЛЕ ДЛЯ ЧАГО?
О! ЯШЧЭ ЗНАКІ!


НЯЎЖО ПАТАЕМНЫ ШЫФР УВЕСЬ ГЭТЫ ЧАС БЫЎ У МЯНЕ ПАД НОСАМ І Я ЯГО НЕ ЗАЎВАЖАЛА?
ШТО ТЫ НА ГЭТЫ РАЗ СХАВАЎ, ДЗЯДУЛЯ?
ТУТ МУСІЦЬ БЫЦЬ ЦІ ШТОСЬЦІ ЛІШНЯЕ, ЦІ ТАКОЕ, ШТО НЕЯК АДРОЗНІВАЕЦЦА АД УСЯГО АСТАТНЯГА.


ЁСЦЬ! ГЭТА ШТУКА ПАДОБНА ДА АДЗІНКІ!
А СІМВАЛЫ ЗНОЎ КУДЫСЬЦІ РУХАЮЦЦА.


ПАДАЕЦЦА, ЦЯПЕР Я РАЗУМЕЮ, ШТО СКЛЕП ЗАМЫКАЛІ НЕ ПРОСТА ТАК...
З УСІХ ПЛІТАЧАК ВЫЛУЧАЕЦЦА ГЭТЫ ПРАМАВУГОЛЬНІК.
У ІМ ЁСЦЬ ФІГУРЫ З АДНОЙ, ТРОХ І ЧАТЫРОХ КЛЕТАЧАК.


ЛІЧБЫ З КАМБІНАЦЫІ!
ТРЫ...
КЛАК
... ЧАТЫРЫ...
КЛАК
... АДЗІН!
КЛАК
ШЧОЎК!


Поўны збор таямніц і загадак зямель беларускіх.
Уласнасць Кастуся Сенагдовіча.


Тым самым я вылучаю здагадку,
што іншапланетная фармацыя
шматразова наведвала беларускія
землі, не пакідаючы пры гэтым слядоў
свайго знаходжання. Альбо
пакідаючы, але спрытна маскіруючы
іх. Рызыкну дапусціць, што мы маем
справу з расай, якая ставіць
у абсалют здольнасць маскіроўкі
АЛЕСЯ, ТЫ ЎПЭЎНЕНА, ШТО ГЭТА НЕ ЯКІ-НЕБУДЗЬ РОЗЫГРЫШ?
ТЫ ПАЧАКАЙ, БАГДАН! ЗАРАЗ Я ВАМ РАСКАЖУ, ЯК ГЭТА ТРАПІЛА ДА МЯНЕ Ў РУКІ!
ДАВАЙ ТЫ НАМ У АЎТОБУСЕ РАСПАВЯДЗЕШ. НАС ЧАКАЕ ДОЎГАЯ ВАНДРОЎКА.



Пакуль фантастычныя акуляры ёсць толькі ў Алесі, але і ты ўбачыш любы патаемны шыфр, калі будзеш трэніраваць зрок з дапамогай вось гэтых практыкаванняў. Сачы за стрэлкамі – хто ведае, куды яны прывядуць цябе.



# Не для чужых вачэй




МЫ ЗНАХОДЗІМСЯ З ВАМІ Ў ЦЭНТРЫ КРОМЛЕХА, ЯКІ МАЕ НАЗВУ «БРАМА ЎСІХ ЗОРАК». ГЭТА АДНО З НАЙСТАРАЖЫТНЕЙШЫХ У ГІСТОРЫІ ЧАЛАВЕЦТВА РУКАТВОРНЫХ ЗБУДАВАННЯЎ.


КОМПЛЕКС ЗАСНАВАНЫ НА 12 МЕНГІРАХ – ВАЛУНАХ, ШТО РАЎНАМЕРНА РАЗМЕРКАВАНЫЯ ПА 12-МЕТРОВЫМ КРУЗЕ.
ШТО ТАКОЕ КРОМЛЕХ?
МЫ МЯРКУЕМ, ШТО КАМЯНІ СІМВАЛІЗУЮЦЬ СУЗОР'І ЗНАКАЎ ЗАДЫЯКА, А КАМЕННАЯ ПЛІТА Ў ЦЭНТРЫ...
НУ ВОСЬ ЖА, ТУТ УСЁ НАПІСАНА!
ЧАМУ ВЫ МНЕ НЕ ВЕРЫЦЕ?
ДЫ ТАМУ, ШТО ГЭТА ВЫГЛЯДАЕ ЗАНАДТА НЕПРАЎДАПАДОБНА. СКАЖЫ, БАГДАН?
ВЫБАЧАЙ, АЛЕСЯ, АЛЕ ТУТ Я ПАГАДЖУСЯ З ІЛЬЁЙ.
ТУП ТУП


ЧЫМ ВЫ ЗНОЎ ЗАЙМАЕЦЕСЯ? ВЫ НА ЭКСКУРСІЮ ПРЫЕХАЛІ ЦІ АДЗІН З АДНЫМ РАЗМАЎЛЯЦЬ?
ОЙ, ДАРУЙЦЕ, КАЛІ ЛАСКА! МЫ ПРОСТА АБМЯРКОЎВАЛІ ГЭТЫЯ... ЭМММ... КАМЯНІ.
ШУРХ
ВЯРТАЙЦЕСЯ ДА ГРУПЫ.


ДОБРА, КАЛІ ВЫ МНЕ НЕ ВЕРЫЦЕ, Я САМА ДАВЯДУ, ШТО ЎСЁ Ў ГЭТЫМ ДЗЁННІКУ ПРАЎДА!
СЁННЯ СКЛАДАНА СКАЗАЦЬ, ДЛЯ ЧАГО ЎЗВОДЗІЛІСЯ КРОМЛЕХІ. АСТРОЛАГІ, НАПРЫКЛАД, МЯРКУЮЦЬ, ШТО ЯНЫ З'ЯЎЛЯЮЦЦА ПАРТАЛАМ У ІНШЫЯ СУСВЕТЫ.


АЛЕСЯ, ДАЙ МНЕ ДЗЁННІК.
АГА, ЗНАЧЫЦЬ, ЦЯПЕР ЁН ТАБЕ ПАТРЭБНЫ?
ТЫ САМА ПАГЛЯДЗІ: ЗНАКІ З ДЗЁННІКА СУПАДАЮЦЬ З СІМВАЛАМІ НА ТЫМ КАМЕНІ!
ШУХ!
ОГО, І ПРАЎДА! АДЗІН У АДЗІН!
АЛЕ ЯК НАМ ПАДАБРАЦЦА ДА ЯГО БЛІЖЭЙ? КЛАСНАЯ Ж ЗАЎВАЖЫЦЬ, ШТО МЫ ЗНОЎ НЕ СЛУХАЕМ ЭКСКУРСІЮ.
ЁСЦЬ У МЯНЕ ІДЭЙКА...
КЛАК
ДЗЫНЬК!


САКРЭТНЫ ЧАЦІК
Багдан
Адцягні ўвагу класнай, нам патрэбна сёе-тое праверыць.
ЧАМУ ЗАЎЖДЫ Я...
ВЫБАЧАЙЦЕ, А КАЛІ МЫ БУДЗЕМ АБЕДАЦЬ?
ІЛЬЯ, МЫ ЕЛІ ПАЎГАДЗІНЫ ТАМУ...
ВІДАЦЬ, ТВОЙ ДЗЯДУЛЯ ЎЖО ВЫВУЧАЎ ГЭТЫЯ СІМВАЛЫ, НАВАТ СКЛАЎ ШТОСЬЦІ КШТАЛТУ АЛФАВІТА.


І НАДПІС НАМАГАЎСЯ РАСШЫФРАВАЦЬ...
ГМ... «КЛІЦА»... ШТО ЗА «КЛІЦА»? НІЧОГА НЕ РАЗУМЕЮ...
НЕ ВЕДАЮ... НЕЙКАЯ СТАРАЖЫТНАЯ МОВА? А МОЖА, ТВОЙ ДЗЯДУЛЯ НЕ ЎСЕ СІМВАЛЫ ЗНАЙШОЎ – У КАМЕНЯ ВУНЬ КАВАЛКА НЕ ХАПАЕ.
А ГЭТА, ДАРАГІЯ МАЕ, УНІКАЛЬНАЯ ЗНАХОДКА. ЗУСІМ НЯДАЎНА БЕЛАРУСКІЯ АРХЕОЛАГІ АДШУКАЛІ ЧАСТКУ АДНАГО З МЕНГІРАЎ, ЯКОЙ НЕ ХАПАЛА.


ПАКУЛЬ ШТО ЗНАХОДКА ЗАХОЎВАЕЦЦА ПАД ШКЛОМ.
АЛЕ НЕЎЗАБАВЕ НАШЫ СПЕЦЫЯЛІСТЫ МУСЯЦЬ ПРЫСТУПІЦЬ ДА РЭСТАЎРАЦЫЙНЫХ РАБОТ.
ШТУРХ
ШТУРХ
І ГЭТЫ БЯСЦЭННЫ КАВАЛАЧАК ГІСТОРЫІ ВЕРНЕЦЦА НА СВАЁ ЗАКОННАЕ МЕСЦА.
ГМММ...
«КАПЛІЦА!»
НА ЖАЛЬ, КАПЛІЦУ ТАКСАМА РЫХТУЮЦЬ ДА РЭСТАЎРАЦЫІ І МЫ НЕ ЗМОЖАМ ТУДЫ ТРАПІЦЬ. АЛЕ НАПЕРАДЗЕ НАС ЧАКАЕ ЯШЧЭ ШМАТ ЦІКАВЫХ МЕСЦАЎ.
АГА, ЗРАЗУМЕЛА.


ТРЭБА РАСПАВЕСЦІ ЎСЁ ІЛЫ І ХУТЧЭЙ АДШУКАЦЬ ГЭТУ КАПЛІЦУ!
УЖО ЗНАЙШОЎ. МЯРКУЮЧЫ ПА КАРЦЕ, ЯНА НЕДАЛЁКА.
...І МЕНАВІТА ТАМУ МОЖНА ДАПУСЦІЦЬ, ШТО ВІКІНГІ АТАБАРЫЛІСЯ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ.
ІЛЬЯ, ТЫ НА ДЗІВА ДОБРА ВЕДАЕШ ГІСТОРЫЮ. НЕ ХОЧАШ ПАЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У АЛІМПІЯДЗЕ?
ВЫБАЧАЙЦЕ, АЛЕ НАМ ТЭРМІНОВА ТРЭБА Ў ПРЫБІРАЛЬНЮ!
ВЖУХ!
АЛЕ ПРЫБІРАЛЬНЯ Ж НЕ Ў ГЭТЫМ БАКУ...
ДЫ НЕ ТУДЫ МЫ ІДЗЁМ! Я Ж КАЗАЛА, ШТО ДЗЯДУЛЕЎ ДЗЁННІК – ГЭТА НЕ НЕЙКАЕ ГЛУПСТВА. ДЫК ВОСЬ...
АГА, ТУТ НАЛЕВА...


ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ, НАДПІС НА СТАРАЖЫТНЫМ КАМЕНІ ЎКАЗВАЎ НА СУЧАСНУЮ КАПЛІЦУ? ВЫ ДАКЛАДНА ПРАВІЛЬНА РАСШЫФРАВАЛІ НАДПІС? А ІНШЫЯ КАМЯНІ ПРАВЯРАЛІ?
НЕ... АЛЕ ГЭТА Ж НЕ МОЖА БЫЦЬ ПРОСТА СУПАДЗЕННЕ!
НУ... МАГЧЫМА, СЁННЯ МЫ РАСКРЫЕМ ТАЯМНІЦУ ГЭТЫХ СТАРАЖЫТНЫХ КАМЯНЁЎ!
КРХХХ!


ЗАРАЗ СКАРЫСТАЕМ САКРЭТНАЕ ПРЫСТАСАВАННЕ ДЗЯДУЛІ І ПРА ЎСЁ ДАВЕДАЕМСЯ!
ПЛАН «А» НЕ СПРАЦАВАЎ...
ТАМУ ПЕРАХОДЗІМ ДА ПЛАНА «Б»: ШУКАЕМ САМІ!
ШТО ШУКАЕМ?
МОЖА, ШТОСЬЦІ НЕЗВЫЧАЙНАЕ?


ГМММ...
КЛАК
Ф'ЮП!
ПАДАЕЦЦА, Я ШТОСЬЦІ ЗНАЙШОЎ...
ЦАГЛІНУ?


А-А-А-А! ШТО АДБЫЛОСЯ? ДЗЕ МЫ?


ГЭТА ЎСЁ ПА-САПРАЎДНАМУ?
ПАДОБНА НА ТОЕ. ПАДЛОГА СТАЛА МЕТАЛІЧНАЯ!
ІЛЬЯ, ХУТЧЭЙ, ВЯРНІ ЦАГЛІНУ НА МЕСЦА!


ТАК, ЗАРАЗ-ЗАРАЗ!
ХРАСЬ!
СЯБРЫ... ТУТ НЕВЯЛІКАЯ ПРАБЛЕМА...
ІЛЬЯ! ШТО ТЫ НАРАБІЎ?
ВЖУХ
ДЫ Я НАЦІСНУЎ ЗУСІМ КРЫХУ! ГЭТА ВЫПАДКОВА АТРЫМАЛАСЯ!
ШУХ


А МОЖА, ГЭТА З-ЗА ЦЯБЕ ДЗВЕРЫ ЗАЧЫНІЛІСЯ? НАВОШТА ТЫ НАГОЙ ПА ПАДЛОЗЕ СТУКАЛА?
НУ, ВЯДОМА!
СЯБРЫ, СЮДЫ!
ПАНЭЛЬ З'ЯВІЛАСЯ ПАСЛЯ ТАГО, ЯК ЗАЧЫНІЛІСЯ ДЗВЕРЫ. МНЕ ПАДАЕЦЦА, ГЭТА НЕЙКАЯ АХОЎНАЯ СІСТЭМА.
ЗНАЧЫЦЬ, ЯЕ МОЖНА АДКЛЮЧЫЦЬ, І ДЗВЕРЫ АДЧЫНЯЦЦА!
АЛЕ ЯК? ТУТ ПРОСТА НЕЙКІЯ ЛІНІІ... І ЯШЧЭ ЛІНІІ... ЗАШМАТ ЛІНІЙ!
ГМ... А ШТО, КАЛІ ГЛЯДЗЕЦЬ НЕ НА ЛІНІІ, А ПАМІЖ ІМІ...



Я БАЧУ!
ТУТ ПРАСОЧВАЕЦЦА КОНТУР. КАЛІ ПАСПРАБАВАЦЬ ПРАВЕСЦІ ПА ІМ...
...ТО ДЗВЕРЫ АДЧЫНЯЦЦА.
ВАЎ! БАГДАН, ТЫ МАЛАЙЧЫНА!
ХЕХ! ЯК БАЧЫШ, НЕ ТОЛЬКІ Ў ЦЯБЕ ЁСЦЬ КРУТЫЯ АКУЛЯРЫ.
ПРАПАНУЮ БЕГЧЫ АДСЮЛЬ. І ХУТЧЭЙ!
ШЧОЎК!


ПАЧАКАЙЦЕ, ТУТ ЯШЧЭ ШТОСЬЦІ ЁСЦЬ.


ШТО ТЫ РОБІШ? ТРЭБА ІСЦІ, ПАКУЛЬ ДЗВЕРЫ ЗНОЎ НЕ ЗАЧЫНІЛІСЯ!
ТУТ ЧАРГОВАЯ ЗАГАДКА! УПЭЎНЕНЫ, ШТО ЗМАГУ ЯЕ РАШЫЦЬ. ТОЛЬКІ ВОСЬ ЗБЛІЗУ ЎСЁ ЗЛІВАЕЦЦА... МОЖА, АДЫСЦІ ДАЛЕЙ?




ЁСЦЬ! ВЫРАЗНА БАЧУ ТРЫ СІМВАЛЫ! ХОЦЬ ТУТ МНЕ ДАЛЬНАЗОРКАСЦЬ ДАПАМАГЛА!
ПАСПРАБУЮ ЎВЕСЦІ ІХ НА ПАНЭЛІ.
ШЧОЎК!
БАГДАН, АСЦЯРОЖНА!
УХ ТЫ! ЦІКАВА, ШТО ГЭТА?
Я Б НЕ КРАНАЛА ГЭТА РУКАМІ...
А Я ЗАБРАЎ БЫ З САБОЙ. ХІБА ДАРЭМНА МЫ ПРАХОДЗІЛІ ПРАЗ УСЁ ГЭТА?


ПРАЗ «УСЁ ГЭТА» МЫ ПРАХОДЗІЛІ З-ЗА ЦЯБЕ, ДАРЭЧЫ!
А НАГАДАЦЬ ТАБЕ, ХТО НАС СЮДЫ ЎВОГУЛЕ ПРЫВЁЎ?
ВЖЖЖЖУУУУ!
ВАЛІМ, ВАЛІМ, ВАЛІМ!
АЧМУРЭЦЬ! ГЭТА Ж КАСМІЧНЫ КАРАБЕЛЬ! Я ПАВІНЕН ЯГО СФОТКАЦЬ!
НЕ ЗАРАЗ!


ГЭТА ШТУКА ГРЫМІЦЬ ТАК, БЫЦЦАМ ВОСЬ-ВОСЬ ВЫБУХНЕ! ТРЭБА ПАПЯРЭДЗІЦЬ АСТАТНІХ!
А Я БОЛЬШ БАЮСЯ, ШТО НАМ АД КЛАСНАЙ ПЕРАПАДЗЕ...
МЕХАНІЗМ ЗАМАСКІРАВАНЫ І СПЫНЕНЫ, ДОБРА.
ЗАСТАЛОСЯ ВЯРНУЦЬ КЛЮЧ.




## З НЛА НІКОЛІ НЕЛЬГА ЗВОДЗІЦЬ ВАЧЭЙ!

| УЗРОВЕНЬ НЕБЯСПЕКІ |
| --- |
| НІЗКІ (зялёны) |
| СЯРЭДНІ (жоўты) |
| ВЫСОКІ (чырвоны) |

| Дзеянне | Значэнне | Узровень |
| --- | --- | --- |
| Падніміце вочы ўверх, апусціце ўніз. | НЛА рыхтуецца да пасадкі. | жоўты |
| Паглядзіце ўлева ўверх, потым управа ўніз. | НЛА знаходзіцца ў рэжыме сканіравання. | зялёны |
| Абвядзіце вачамі ўяўны прамавугольнік: знізу–ўверх–управа–ўніз – улева. | НЛА маскіруе тэрыторыю. | чырвоны |
| Скасіце вочы ўправа, затым улева. | НЛА рыхтуецца да звышгукавога рыўка. | зялёны |
| Зрабіце павольны кругавы рух. | НЛА сканіруе чалавека. | чырвоны |
| Намалюйце зрэнкамі хвалістую лінію. Спачатку ўлева, затым управа. | НЛА падымае раней прасканіраванага чалавека. | чырвоны |

# Убачыць таямніцу




НУ ШТО, ПАСПРАБУЕМ ЗНОЎ РАСКАЗАЦЬ ПРА ТОЕ, ШТО АДБЫЛОСЯ?


ТЫ ПАМЯТАЕШ, ЧЫМ МІНУЛЫМ РАЗАМ УСЁ СКОНЧЫЛАСЯ? НІХТО НАМ НЕ ПАВЕРЫЎ, НАВАТ ЯШЧЭ І НАСВАРЫЛІСЯ НА НАС ЗА ТОЕ, ШТО МЫ ЗБЕГЛІ З ЭКСКУРСІІ.
У ТОЙ РАЗ МЫ БЫЛІ ЗАНАДТА ЎСХВАЛЯВАНЫЯ. МОЖА, КАЛІ ЎСЁ СПАКОЙНА ПАТЛУМАЧЫЦЬ...
І ЯК ТЫ САБРАЎСЯ ГЭТА ЗРАБІЦЬ? У НАС НЯМА НІЯКІХ ДОКАЗАЎ.
У НАС ЁСЦЬ ГЭТА ШТУКА.
І ШТО? МЫ ТАК І НЕ ЗРАЗУМЕЛІ, ШТО ЯНА РОБІЦЬ.
ТЫ НАВАТ РАЗАБРАЦЬ ЯЕ СПРАБАВАЎ, І НІЧОГА НЕ АТРЫМАЛАСЯ.
ШУРХ!
ГМ.
А ДАВАЙЦЕ ПАКАЖАМ ДЗЯДУЛЕВЫ АКУЛЯРЫ Ў ДЗЕЯННІ! ТАДЫ Ў ГІСТОРЫЮ З КАРАБЛЁМ УСЕ ПАВЕРАЦЬ!
ТОЛЬКІ АПОШНІМ ЧАСАМ ЯНЫ ШТОСЬЦІ ПЕРАСТАЛІ ПРАЦАВАЦЬ...


ВОСЬ БАЧЫЦЕ. ПАКУЛЬ МЫ САМІ ВА ЎСІМ НЕ РАЗБЯРОМСЯ І НЕ ЗНОЙДЗЕМ ДОКАЗАЎ, ЯКІХ БУДЗЕ ДАСТАТКОВА, НАМ НІХТО НЕ ПАВЕРЫЦЬ.
КЛАС, ПРАШУ ХВІЛІНУ ЎВАГІ. СЁННЯ ДА НАС ДАЛУЧАЕЦЦА НОВЫ ВУЧАНЬ.
УСІМ ПРЫВІТАННЕ! МЯНЕ ЗАВУЦЬ ПЕЦЯ.
БУДУ ВЕЛЬМІ РАДЫ...
...ПАСЯБРАВАЦЬ З ВАМІ.


МОЖАШ ВЫБРАЦЬ ЛЮБОЕ ВОЛЬНАЕ МЕСЦА ЗА ПАРТАЙ.
УСЕ АСТАТНІЯ, РАССАДЖВАЙЦЕСЯ ПА МЕСЦАХ І ДАСТАВАЙЦЕ ПАДРУЧНІКІ.
ПАГАВОРЫМ НА ПЕРАПЫНКУ.
ДОБРА.
ПРЫВІТАННЕ! МОЖНА СЕСЦІ ПОБАЧ З ТАБОЙ?
ЭЭЭ...
ВЫБАЧАЙ, АЛЕ З ІЛЬЁЙ СЯДЖУ Я.
АДКРЫЙЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, ПАДРУЧНІК НА СТАРОНЦЫ 39, УРОК 4.



Кабінет № 10 ГЕАГРАФІЯ
НУ ШТО, У СТАЛОВУЮ? АБМЯРКУЕМ ПЛАН ДЗЕЯННЯЎ, А ЗААДНО І ПАЯДЗІМ!
ЗГОДНАЯ! Я АКУРАТ УЖО ХАЧУ ЕСЦІ.
ПРЫВІТАННЕ, МЯНЕ ЗАВУЦЬ МІША. АДКУЛЬ ТЫ ПРЫЕХАЎ?
ВЫБАЧАЙ, Я ЗАРАЗ ЗАНЯТЫ.
ПАСЛЯ НАШАЙ ПАЕЗДКІ Я ЎВАЖЛІВА ЧЫТАЎ НАВІНЫ – РАПТАМ ХТОСЬЦІ ЯШЧЭ БАЧЫЎ ГЭТЫ КАРАБЕЛЬ. АЛЕ НІЧОГА АКРАМЯ ФЭЙКАВЫХ АРТЫКУЛАЎ НЕ ЗНАЙШОЎ.
А ШТО КАЛІ КАРАБЕЛЬ ЗНОЎ МАСКІРУЕЦЦА?


ГЭТА ДЗІЎНА. КАЛІ БАГДАН УЗЯЎ ТУЮ МЕТАЛІЧНУЮ КРОПЛЮ, Я БЫЛА ЎПЭЎНЕНАЯ, ШТО КАРАБЕЛЬ ЦІ ЎЗЛЯЦІЦЬ, ЦІ ВЫБУХНЕ.
МОЖА, ШТОСЬЦІ З ГЭТАГА І АДБЫЛОСЯ – НАМ АДКУЛЬ ВЕДАЦЬ?
ТУП
ТУП
ПРЫВІТАННЕ! МОЖНА ДА ВАС?
А, ПРЫВІТАННЕ... ПЕЦЯ, ТАК? МЫ ТУТ ПРОСТА АБМЯРКОЎВАЕМ...
ЦУДОЎНА! ЛЮБЛЮ РАЗМОВЫ! ШТО ВЫ ТУТ АБМЯРКОЎВАЕЦЕ?
ШУХ!



ФУХ, ЛЕДЗЬ АДВЯЗАЛІСЯ.
У ШКОЛЕ ЎВОГУЛЕ ЁСЦЬ МЕСЦА, ДЗЕ МОЖНА ПАГАВАРЫЦЬ БЕЗ ЧУЖЫХ ЛЮДЗЕЙ?
НУ, НЕКАЛЬКІ ВАРЫЯНТАЎ Я ВЕДАЮ!
ХЭЙ!
МОЖНА Я...
...ПАГАВАРУ З ВАМІ?
ХАЧУ ПАСЯБРАВАЦЬ!
ПЕЦЯ, ЦІ НЕ МОГ БЫ ТЫ ПАЧАКАЦЬ ЗА ДЗВЯРЫМА?


МНЕ АДНАМУ ПАДАЕЦЦА, ШТО ПЕЦЯ ЎСЮДЫ НАС ПЕРАСЛЕДУЕ?!
ШТО Ж... ЗАСТАЎСЯ АПОШНІ ВАРЫЯНТ.
БІБЛІЯТЭКА
ТУК
ТУК
БІБЛІЯТЭКА
УРОКІ СКОНЧЫЛІСЯ, БІБЛІЯТЭКА ЗАЧЫНЯ... А, ГЭТА ТЫ, ІЛЬЯ. ЗНОЎ ДА ПОЗНЯЙ НОЧЫ ЗА КНІЖКАМІ СЯДЗЕЦЬ САБРАЎСЯ?


ТАК! І МОЖНА МНЕ ЯШЧЭ СЯБРОЎ ПРЫХАПІЦЬ?
ДОБРА, УСЁ АДНО МНЕ КНІЖКІ ПРЫНЯЦЬ ТРЭБА, ТАК ШТО ЗАХОДЗЬЦЕ.
АЛЕ ТЫ ПРАВІЛЫ ВЕДАЕШ: НЕ ШУМЕЦЬ, НЕ ПЕРАШКАДЖАЦЬ, КНІЖКІ ВЯРНУЦЬ НА МЕСЦА.
УГУ, ЗРАЗУМЕЎ. ДЗЯКУЙ!
БЛІЯТЭКА
ЛЯСЬ!
ЗАЧЫНЕНА. Прыём кніг.
ЗАЧЫНЕНА. Прыём кніг.


ТЫ СЯБРУЕШ З БІБЛІЯТЭКАРКАЙ?
Я ПРОСТА ЧАСТА ТУТ БЫВАЎ НА ЛЕТНІХ КАНІКУЛАХ. АДНОЙЧЫ ДАПАМОГ РАССАРТАВАЦЬ КНІГІ. З ТАГО ЧАСУ ЯНА ДОБРА ДА МЯНЕ СТАВІЦЦА.
АЛЕ ГЭТА ЎСЁ НЕ МАЕ ЗНАЧЭННЯ – МЫ, НАРЭШЦЕ, МОЖАМ СПАКОЙНА АБМЕРКАВАЦЬ НАШ ПЛАН.
Я Ў ІНТЭРНЭЦЕ АДШУКАЎ СПІС КНІГ, ЯКІЯ МОГУЦЬ ДАПАМАГЧЫ НАМ, – ДАВАЙЦЕ ІХ ТУТ ЗНОЙДЗЕМ.
СКРЫЫЫЫ
ВЫБАЧАЙЦЕ, АЛЕ БІБЛІЯТЭКА ЎЖО ЗАЧЫНЕНАЯ.


НІКОГА? СКРАЗНЯК ЦІ ШТО...
ІЛЬЯ, ВУНЬ ТАМ ПАТРЭБНАЯ КНІГА, СПРАВА АД ЦЯБЕ.
ЗЛЕВА...
ТАК, ЗАРАЗ. ЗЛЕВА.
НУ, ВОСЬ ЖА ЯНА! ТЫ БЫЦЦАМ АСЛЕП.


ХВІЛІНАЧКУ... ТЫ СЁННЯ ДЗІЎНА ТРЫМАЎ ПАДРУЧНІК, КАЛІ ЧЫТАЎ НА ЎРОКУ. А Ў БУФЕЦЕ ВЕЛЬМІ НІЗКА НАХІЛЯЎСЯ ДА ЦЭННІКАЎ.
НУ... НАОГУЛ... МАГЧЫМА, Я ТРОХІ ПАСАДЗІЎ САБЕ ЗРОК ЗА ЧЫТАННЕМ.
ЧАМУ ТАДЫ ТЫ НЕ НОСІШ АКУЛЯРЫ?
НЯМА ПАТРЭБЫ. Я ЎСЁ ЯШЧЭ НАРМАЛЬНА БАЧУ.
НАРМАЛЬНА? ТЫ ТРЫМАЎ КНІГУ ПЕРАД САМЫМ НОСАМ!
НУ І ШТО? НЕ ПАМРУ Ж Я АД ГЭТАГА!
ВЫ ЧАГО ТАМ УЗНЯЛІ ТАКІ ШУМ?


УЯЎЛЯЕШ, У ІЛЫ САПСАВАЎСЯ ЗРОК, А ЁН НЕ ХОЧА НАСІЦЬ АКУЛЯРЫ!
ІЛЬЯ, ТАК НЕЛЬГА. ТРЭБА ПРАВЕРЫЦЬ ЗРОК У ДОКТАРА.
ГЭТА МАЯ СПРАВА, ТАК ШТО ДАВАЙЦЕ ЗМЕНІМ ТЭМУ.
БАЦ!
АКУЛЯРЫ НА МЯНЕ РАПТОЎНА НЕ ЎПАДУЦЬ, А КНІЖКІ ВОСЬ ТУТ. БАГДАН, ЯКІЯ НАМ ЯШЧЭ ПАТРЭБНЫЯ?
ШТО ГЭТА, АДКУЛЬ ЯНЫ?


КАЛІ ЛАСКА, НЕ БОЙЦЕСЯ. Я ПРОСТА ХАЧУ З ВАМІ ПАГАВАРЫЦЬ.
ПЕЦЯ? ЯК ТЫ ТУТ АКАЗАЎСЯ?
Я ЎСЁ ПАТЛУМАЧУ.
ТОЛЬКІ СПАЧАТКУ ВЯРНІЦЕ АКУЛЯРЫ.


ІЛЬЯ! Я Ж ПРАСІЛА НЕ ШУМЕЦЬ!
А ТЫ ЯК ТУТ АКАЗАЎСЯ?
ЗАТРЫМАЎСЯ ПАСЛЯ ЎРОКАЎ... НЕ ПАДКАЖАЦЕ, ДЗЕ ТУТ ДЗВЕРЫ? БЕЗ АКУЛЯРАЎ Я НЕ МАГУ НАРМАЛЬНА БАЧЫЦЬ...
ОХ, ДРУЖА, ЯНА ТУТ, ЗЛЕВА. ТАБЕ ДАПАМАГЧЫ?


НЕ, ДЗЯКУЙ, Я Ў ПАРАДКУ.
БЯЖЫМ, НЕ СПЫНЯЙЦЕСЯ!
ПАЧАКАЙЦЕ!
СЛІЗГ
НЕ ПАДЫХОДЗЬ ДА ЯГО! ТЫ БАЧЫЎ ЯГО ВОЧЫ?
АЛЕ Ж ЁН НІЧОГА БЛАГОГА НАМ НЕ ЗРАБІЎ! ДАВАЙЦЕ ВЫСЛУХАЕМ ЯГО...


КАЛІ ЛАСКА, МНЕ ПАТРЭБНА ВАША ДАПАМОГА. У ВАС ЗАРАЗ ЗНАХОДЗІЦЦА РЭЧ, ЯКАЯ ЗМОЖА ВЯРНУЦЬ МЯНЕ ДАДОМУ.
Я ЎСЁ РАСКАЖУ! ТОЛЬКІ ВЯРНІЦЕ АКУЛЯРЫ: БЕЗ ІХ Я БАЧУ ГОРШ У ВАШЫМ ВЫМЯРЭННІ.


ДОБРА. ВОСЬ ТВАЕ АКУЛЯРЫ. ЦЯПЕР РАСКАЗВАЙ, ШТО ЎСЁ ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ І ХТО ТЫ ТАКІ. ТОЛЬКІ ЧЭСНА.
ДЗЯКУЙ, ШТО ПАВЕРЫЛІ МНЕ. ЗАРАЗ УСЁ ПАТЛУМАЧУ.
Я ПРЫБЫЎ У ВАШ СУСВЕТ З ІНШАГА ВЫМЯРЭННЯ. Я ПАВІНЕН ЗАБРАЦЬ МЕХАНІЗМ, ПАКІНУТЫ МАІМІ ПРОДКАМІ ШМАТ ГАДОЎ ТАМУ, ПАКУЛЬ ЛЮДЗІ ЯГО НЕ АДШУКАЛІ.
ПАД «МЕХАНІЗМАМ» ТЫ МАЕШ НА ЎВАЗЕ КАСМІЧНЫ КАРАБЕЛЬ?
У ВАШАЙ МОВЕ ЛЕПШ ПАДЫШЛО Б ВЫЗНАЧЭННЕ «ТЭЛЕПОРТ».
АЛЕ ТАК АТРЫМАЛАСЯ, ШТО ВЫ ЗНАЙШЛІ ТЭЛЕПОРТ РАНЕЙ І ЗАБРАЛІ АДТУЛЬ КЛЮЧ...
ПАЧАКАЙ, АЛЕ ЯК ТЫ ДАВЕДАЎСЯ, ШТО КЛЮЧ У НАС?


ГМ.
Я БЫЎ РАЗАМ З ВАМІ НА ТОЙ ЭКСКУРСІІ. ТАКСАМА ШУКАЎ ПАДКАЗКУ, ШТО ЎКАЗАЛА Б МНЕ НА МЕСЦАЗНАХОДЖАННЕ ТЭЛЕПОРТА.
ЗНАЧЫЦЬ, ГЭТЫ КЛЮЧ ЛЕПШ ВЯРНУЦЬ ТАБЕ?
ТАК, МЕНАВІТА ЁН АДКРЫВАЕ ПАРТАЛ ПАМІЖ ВЫМЯРЭННЯМІ.
ДЗЯКУЙ ВАМ, СЯБРЫ! ЧАС І МНЕ ВЯРНУЦЦА ДАДОМУ.


ПАЧАКАЙ! КАЛІ ТЫ ПАЛЯЦІШ ЗАРАЗ, НАМ ДАКЛАДНА НІХТО НЕ ПАВЕРЫЦЬ! МЫ ПАВІННЫ ПАКАЗАЦЬ ЦЯБЕ СВЕТУ!
ЦІ ПАКІНЬ НАМ ЯКУЮ-НЕБУДЗЬ ТЭХНІЧНУЮ ШТУКУ. ТАДЫ Я ЗМАГУ ДАВЕСЦІ, ШТО ЎСЕ ЗДАГАДКІ ДЗЯДУЛІ АБ ІНШАПЛАНЕЦЯНАХ – ПРАЎДА!
БАЮСЯ, НАВАТ З ІМІ ВАМ НІХТО НЕ ПАВЕРЫЦЬ. ХАЦЯ Ў МЯНЕ ЎСЁ Ж ЁСЦЬ ШТОСЬЦІ ДЛЯ ВАС.
ГЭТА ТАБЕ, ІЛЬЯ. ЯНЫ САМІ ПАДЛАДЗЯЦЦА ПАД ТВОЙ ЗРОК.
КАЛІСЬЦІ ЯНЫ ДАПАМАГЛІ МНЕ, А ЗАРАЗ ДАПАМОГУЦЬ ТАБЕ – НЕ ПАЗБАЎЛЯЙ СЯБЕ МАГЧЫМАСЦІ ДАКЛАДНА БАЧЫЦЬ. БО НАЎКОЛ СТОЛЬКІ ПРЫГОЖАГА!
ВОСЬ ДЫК ПРЫГОДА ВЫДАЛАСЯ. А ПАЧЫНАЛАСЯ ЎСЁ СА ЗВЫЧАЙНЫХ АКУЛЯРАЎ.
ЗВЫЧАЙНЫЯ – ГЭТА Ў МЯНЕ. А Ў ЦЯБЕ ЯНЫ СІМВАЛЫ НА СЦЕНАХ ПРАЯЎЛЯЛІ!
ОЙ, А Я, АКАЗВАЕЦЦА, НАСАМРЭЧ ДРЭННА ДАГЭТУЛЬ БАЧЫЎ. ШКАДА, ШТО Ў НАС НЕ БУДЗЕ БОЛЬШ МАГЧЫМАСЦІ СКАРЫСТАЦЦА НАШЫМІ КРУТЫМІ АКУЛЯРАМІ!
У МЯНЕ АКУЛЯРЫ ЗВЫЧАЙНЫЯ.
НУ, ЯК ВАМ СКАЗАЦЬ... МЫ РАЗАБРАЛІСЯ ТОЛЬКІ З НЕКАЛЬКІМІ СТАРОНКАМІ ДЗЯДУЛЕВАГА ДЗЁННІКА. РАЗУМЕЕЦЕ, ПРА ШТО Я?

# Фан-арты

Пасля выхаду першага выпуску комікса мы адкрылі конкурс фан-артаў і былі вельмі радыя атрымаць шмат выдатных работ ад усіх, хто зацікавіўся нашай гісторыяй. Лепшыя з іх мы прадстаўляем вашай увазе.

Аднак прыём фан-артаў яшчэ працягваецца: дасылайце свае работы на пошту moderncomicsby@gmail.com ці ў асабістыя паведамленні суполкі «Сучасны комікс» (vk.com/modern_comics_by), і мы абавязкова апублікуем іх там.



«Трыа прыгоднікаў»
Павел Пяроўскі / «ПЕРОВСКИЙ»



«Адна галава добра,
а тры – яшчэ лепей»
Аліна Лабус / «BY AMI»



«У пошуках невядомага»
Анастасія Івашкевіч / «Свечка»



«Тунэль у іншае вымярэнне»
Крысціна Няхайчык / «Aurora The Artist»



«Зімовы вечар»
Дар'я Кулікова / «ХВОЯ»



«Кліч цікаўнасці»
Стас Зелень / «Зелень»

# Як стварaўся комікс





## Распрацоўка выгляду галоўных герояў

## Раскадроўка гісторыі



## Этапы работы над старонкай



**Што вы будзеце рабіць, калі раптам да вас у рукі трапіць стары дзённік, поўны таямніц? Канечне ж, вырушыце ў незабыўнае падарожжа, каб праверыць, ці ўсё з напісанага праўда.**

**Вось і неразлучныя сябры – Алеся, Багдан і Ілья – вырашылі адправіцца ў прыгодніцкую вандроўку, каб рашыць заблытаныя загадкі і даведацца, якім чынам звычайныя (ды не толькі!) акуляры могуць дапамагчы пры сустрэчы з нязведаным.**



10+